Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

10 ЛІПЕНЯ 2013 г. СЕРАДА № 125 (27490) Кошт 1600 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Работнікі Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва дапамагаюць нам збіраць грошы на сваю будучую пенсію. СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей НАЛІВАЙКА, першы намеснік міністра па падатках і зборах:

«Беларусь разлічвае ўвайсці ў 2013 годзе ў сотню краін рэйтынга Сусветнага банка па падаткаабкладанні. Сусветны банк асабліва адзначыў крокі нашай краіны па правядзенні рэформаў у падаткаабкладанні. Асабліва адзначана, што Беларусь зрабіла працэс падаткаабкладання больш простым і менш затратным для кампаній. На паляпшэнне пазіцый у рэйтынгу Сусветнага банка ў першую чаргу паўплывалі памяншэнне колькасці дэкларацый, якія прадстаўляюцца, падатковых плацяжоў, значнае скарачэнне колькасці выпадкаў, якія прадугледжваюць абавязковае прадастаўленне дакументаў у падатковыя органы для пацвярджэння льгот».

КАРАТКА

У Беларусі 55 тыс. грамадзян маюць дзве і больш кватэр на праве ўласнасці і выплачваюць падатак з другой кватэры.

Інфляцыя ў краіне ў чэрвені 2013 года склала 0,3 працэнта. Такім чынам, індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў чэрвені ў параўнанні з маем 2013 года склаў 100,3 працэнта, са снежнем 2012-га — 107 працэнтаў.

У Гомелі паўтарагадовае дзіця выпала з акна кватэры, размешчанай на пятым паверсе, і засталося жывым. Маці на некалькі хвілін пакінула сына ў пакоі, дзе было адкрыта акно. Дзіця падчас падзення спачатку ўдарылася аб кандыцыянер, пасля чаго ўпала на кветкавую клумбу, дзе яго і ўбачыла жанчына, якая праходзіла міма.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.07.2013 г.

Долар ЗША	8860,00	▲
Еўра	11420,00	▲
Рас. руб.	268,00	▲
Укр. грыўня	1086,78	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 25°
Віцебск	+ 25°
Гомель	+ 26°
Гродна	+ 23°
Магілёў	+ 23°
Мінск	+ 24°

ISSN 1990 - 763X

СЯЛЕЦКІ ГАСПАДАР

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Шматгадовы вопыт агранома і фермера дазваляе жыхару вёскі Сялец Быхаўскага раёна Мікалаю Кусянкову дасягаць добрых ураджаяў збожжавых і гародніны, у тым ліку і бульбы. Небеспадстаўныя спадзяванні на шчодры ўраджай са сваіх палеткаў у Мікалая Міхайлавіча і сёлета. Сярод многіх фермераў магілёўскага Прыдняпроўя ён лічыцца адным з лепшых майстроў працы на зямлі.

ДАЛЕЙШАЕ ПАШЫРЭННЕ СЭЗ НЕМЭТАЗГОДНА

Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў учора, наведваючы прадпрыемства на тэрыторыі СЭЗ «Магілёў», перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Лічу, што нам размахвацца тут няма чаго, і рабочых месцаў у нас дастаткова. Трэба думаць аб тым, каб, ствараючы прадпрыемства і прадастаўляючы прэферэнцыі, дзяржава штосьці ад гэтага мела», — адзначыў Прэзідэнт.

Міністр эканомікі ў сваю чаргу заўважыў, што, на яго думку, далей развіваць свабодныя эканамічныя зоны не трэба, паколькі на сёння яшчэ далёка не ў поўнай меры асвоены тэрыторыі ўжо існуючых СЭЗ.

«Трэба сур'ёзна заняцца гэтым пытаннем і расставіць усе кропкі над «і», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён адзначыў, што калі будзе інтарэс у прыходзе таго ці іншага інвестара, то ёсць іншыя спосабы для прадастаўлення канкрэтнаму прадпрыемству якіх-небудзь ільгот або прэферэнцый.

Аляксандру Лукашэнку далажылі аб дзейнасці свабодных эканамічных зон у Беларусі і, у прыватнасці, СЭЗ «Магілёў». Паводле слоў Мікалая Снапкова, усе СЭЗ даюць каля 10 працэнтаў агульнага аб'ёму экспарту, а па СЭЗ «Магілёў» — амаль палавіну ў рэгіянальным экспарце. Як растлумачыў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік, гэта ў тым ліку звязана з тым, што перавагамі рэзідэнтаў свабоднай эканамічнай зоны на гэты момант карыстаецца шэраг буйных валаўтваральных прадпрыемстваў. Паводле слоў Прэзідэнта, такую практыку трэба паступова спыняць. «Давайце дамовімся так: гэту пяцігодку дапрацоўваем і ўсё, акрамя замежных прадпрыемстваў. Ім (дзяржпрадпрыемствам. — **Заўвага БелТА**) час да канца пяцігодкі, і трэба прыглядацца да новых кіраўнікоў, якія будуць ведаць, што з 2015 года трэба будзе больш прыкладаць намаганняў і плаціць па поўнай стаўцы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Як адзначыў Прэзідэнт, у Беларусі ўжо не стаіць востра пытанне з рабочымі месцамі, а таму, магчыма, няма неабходнасці прыцягваць з дапамогай СЭЗ прадпрыемствы і даваць ім пэўныя прэферэнцыі. «Больш мы не будзем гэтым займацца, ды я ўжо і так стрымліваў гэты працэс. Але прыцягваць прадпрыемствы, нават з замежным капіталам, такім чынам я не лічу патрэбным», — заявіў кіраўнік дзяржавы, адзначыўшы, што ў Беларусі ёсць шмат менш развітых тэрыторый у невялікіх гарадах і пасёлках, дзе створаны не менш прывабныя ўмовы для інвестараў. Больш таго, такая палітыка ўзгадняецца з дамоўленасцямі ў рамках Адзінай эканамічнай прасторы, дадаў беларускі лідар.

АСОБЫ З «П'ЯНАЙ» ТРАЎМАЙ БАЛЬНІЧНЫ ЗА ПЕРШЫЯ ШЭСЦЬ ДЗЁН НЕ АТРЫМАЮЦЬ

У Беларусі зацверджана новае Палажэнне аб парадку забеспячэння дапамогамі па часовай непрацаздольнасці і па цяжарнасці і родах.

Асноўная навіна заключаецца ў тым, што цяпер не будзе прызначацца дапамога па часовай непрацаздольнасці ў сувязі з захворваннем або траўмай, прычынай якіх з'явілася ўжыванне алкаголю, наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў, за першыя шэсць каляндарных дзён часовай непрацаздольнасці .

Сярод іншых навацый — павелічэнне перыяду, за які дапамога прызначаецца ў памеры 80% сярэднядзённага заробку, з 6 да 12 каляндарных дзён. За наступныя каляндарныя дні бесперапыннай часовай непрацаздольнасці дапамога будзе прызначацца ў памеры 100% сярэднядзённага заробку.

Бальнічны ліст цяпер будзе аплачвацца за каляндарныя дні часовай непрацаздольнасці, а не за рабочыя. Сярэднядзённы заробак для вылічэння бальнічнага ліста будзе вызначацца не за 2, а за 6 каляндарных месяцаў, якія папярэднічаюць месяцу, у якім наступіла хвароба. Сярэднядзённы заробак для вылічэння дапамог і іх памер будзе вызначацца без уліку павелічэння тарыфнай стаўкі (акладу) за шэсць месяцаў, што папярэднічаюць месяцу, у якім з'явілася права на дапамогу, і ў перыядзе часовай непрацаздольнасці або водпуску па цяжарнасці і родах.

Дапамога па часовай непрацаздольнасці будзе прызначацца ў мінімальным памеры асобам, за якіх абавязковыя страхавыя ўзносы на сацыяльнае страхаванне выплачваліся менш чым за 6 месяцаў да хваробы. Мінімальны памер бальнічнага ліста такім работнікам складзе за месяц 50% бюджэту пражыткавага мінімуму.

Святлана БУСЬКО.

ЗАПАВЕДНЫ СВЕТ ПАЛЕСКАЙ АМАЗОНІІ

Спакойны і велічны, як і ўся прырода беларускага Палесся, амаль на 190 тысячах гектараў размясціўся Прыпяцкі дзяржаўны ландшафтна-гідралагічны запаведнік. Заснаваны ён быў у 1969 годзе з мэтай захавання ў першапачатковым выглядзе ўнікальнага і непаўторнага ландшафту, характэрнага для поўдня Беларусі. У 1996 годзе пераўтвораны ў нацыянальны парк.

Запаведнік размешчаны ў паўднёва-заходняй частцы Гомельскай вобласці па правым беразе Прыпяці. Ён выцягнуўся ўздоўж ракі на дзясяткі кіламетраў. З двух бакоў яго тэрыторыю акружваюць рэчкі Убарць і Сцвіга са шматлікімі азёрамі, вадаёмамі і каналамі...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР. 4

ЯПОНСКІЯ ДЗЕЦІ ПРОЙДУЦЬ АЗДАРАЎЛЕННЕ Ў НАС

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне аб выдзяленні сродкаў для арганізацыі адпачынку ў Рэспубліцы Беларусь японскіх дзяцей, якія пацярпелі ад аварыі на АЭС «Фукусіма». Аб гэтым БелТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«У адпаведнасці з дамоўленасцямі з японскім бокам, у Беларусі ў перыяд з 29 ліпеня па 9 жніўня 2013 года пройдуць аздараўленне 25 падлеткаў з Японіі. Адпачынак японскіх дзяцей будзе арганізаваны ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Аналагічная гуманітарная дапамога была аказана Японіі ў 2012 годзе, калі па запрашэнні Прэзідэнта Беларусі 10 японскіх падлеткаў з рэгіёнаў, што пацярпелі ад аварыі на АЭС «Фукусіма», у суправаджэнні двух дарослых адпачывалі і праходзілі аздараўленне ў цэнтры «Зубраня». У праграму адпачынку былі ўключаны адукацыйныя, аздараўленчыя і забаўляльныя мерапрыемствы. У ходзе разнастайных экскурсій было арганізавана азнаямленне з гістарычнай і культурнай спадчынай Беларусі. У мэтах павышэння эфектыўнасці аздараўленчых мерапрыемстваў дзецям з Японіі назначаліся розныя медыцынскія працэдуры. Ім таксама правялі ўльтрагукавое даследаванне шчытападобнай залозы.

НАЦБАНК НЕ ПЛАНУЕ Ў ЛІПЕНІ ЗНІЖАЦЬ СТАЎКУ РЭФІНАНСАВАННЯ

Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БелТА старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Надзея Ермакова.

Пытанне па стаўцы рэфінансавання будзе разгледжана ў бліжэйшы час, адзначыла Надзея Ермакова. «Я лічу, што ў ліпені стаўку пакуль рухаць нельга», — сказала яна. Для гэтага пакуль не склаліся неабходныя ўмовы, растлумачыла кіраўнік Нацбанка. У прыватнасці, зменшыўся прыток валюты ў краіну, у тым ліку ад гандлю таварамі і паслугамі, у той час як попыт на валюту з боку насельніцтва ў сезон адпачынкаў крыху вырас. Каб не змяншаць стаўкі па дэпазітах у беларускіх рублях, у такіх умовах мэтазгодна пакуль не зніжаць стаўку рэфінансавання, адзначыла Надзея Ермакова.

УЛАДАЛЬНІК ДЖЫПА ЗА BR2 млрд НЕДАПЛАЦІЎ МЫТНЫХ ПЛАЦЯЖОЎ І ПАЗБАВІЎСЯ МАШЫНЫ

Джып за Br2 млрд канфіскавалі мытнікі ў даход дзяржавы за спробу ўладальніка машыны не ў поўным аб'ёме заплаціць мытныя пошліны. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі.

Дарагі аўтамабіль Mercedes-Benz G63 AMG 2012 года выпуску спрабавалі ўвезці на тэрыторыю Мытнага саюза па дакументах, якія змяшчалі недакладныя звесткі. Машыну размясцілі пад мытную працэдуру мытнага транзіту Мінскай рэгіянальнай мытні і прад'явілі транспартныя і камерцыйныя дакументы, згодна з якімі кошт гэтага транспартнага сродку склаў 106,9 тыс. еўра. Аднак заяўлены кошт на аўтамабіль выклікаў падазрэнні ў супрацоўнікаў мытні.

Падчас праверачных мерапрыемстваў былі сабраны дастатковыя звесткі, якія сведчаць аб тым, што кошт легкавога аўтамабіля гэтай маркі 2012 года выпуску складае 125,5 тыс. еўра. Значыць, уладальнік машыны недаплаціў мытных плацяжоў на суму звыш Br100 млн. Такім чынам, поўны кошт іншаркі, уключаючы плату мытных плацяжоў у поўным аб'ёме, складае Br2,1 млрд.

Рашэннем суда Кастрычніцкага раёна Мінска транспартны сродак канфіскаваны ў даход дзяржавы.

Кар. БЕЛТА.

ЧАКАНАЯ ПРАЦЯГЛАСЦЬ ЖЫЦЦЯ Ў КРАІНЕ ДАСЯГНУЛА МАКСІМУМУ ЗА АПОШНІЯ 20 ГАДОЎ

У 2012 годзе працягласць жыцця павялічылася ў параўнанні з 2011 годам на 1,6 года і склала 72,2 года. Гэта самы высокі ўзровень больш як за 20 гадоў, паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Апошні раз паказчык чаканай працягласці жыцця перавышаў 72 гады ў 1985 годзе. Чаканая працягласць жыцця пры нараджэнні ў Беларусі супадае з сяроднесусветным значэннем, але ўступае сяроднееўрапейскім паказчыкам. У краіне назіраецца высокая розніца ў працягласці жыцця паміж мужчынамі і жанчынамі, у 2012 годзе яна склала 11 гадоў.

■ Ну і ну!

МУЖЧЫНУ, ЯКІ ЗАБЛУДЗІЎ У ПРЫПЯЦКІМ ЛАНДШАФТНЫМ ЗАКАЗНІКУ, ЗНАЙШЛІ НА ДРЭВЕ

Забалочаная мясцовасць і няведанне правіл арыенціроўкі ў лесе згулялі ракавы жарт з мінчанінам, які прыехаў у Столінскі раён паглядзець прыроду Прыпяцкага ландшафтнага заказніка, паведамілі ў МНС Беларусі.

Столінскім выратавальнікам 8 ліпеня ў 22.30 паступіла паведамленне з сотавага тэлефона ад мінчаніна, які заблудзіў у забалочанай мясцовасці ў раёне вёскі Стахава. Мужчына 1974 года нараджэння расказаў, што самастойна вярнуцца з лесу яму не ўдасца, улічваючы, што набліжаецца ноч.

На пошукі гараджаніна накіраваліся супрацоўнікі МНС бліжэйшага пажарнага аварыйна-выратавальнага паста і супрацоўнікі РАУС. У дзве гадзіны ночы выратавальнікі знайшлі яго на дрэве каля ракі Прыпяць. Ён быў перададзены брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі, шпіталізацыя не спатрэбілася.

Кар. БЕЛТА

■

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне былому намесніку міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лапцёнку Ігару Мікалаевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні былому намесніку міністра інфармацыі Беларусі Ігару Мікалаевічу Лапцёнку ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне дырэктару гандлёвага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Гроднаабласаюздрук» Валчкевічу Тадэвушу Міхайлавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю ЖОНКІ.

■ Нашы грошы

ДЗЕ «РАСЦЕ» ПЕНСІЯ?

Як вы думаеце, хто плаціць нам пенсіі і дапамогі? Дзяржава? Не, правільна будзе адказаць, што мы самі сабе плацім. А калі яшчэ больш дакладна, то нам дапамагаюць збіраць грошы на сваю будучую пенсію. Дапамагаюць работнікі Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, якому, між іншым, сёлета споўнілася 20 гадоў. Цэлае пакаленне беларусаў паспела вырасці за гэты час. А супрацоўнікі Фонду клапаціліся і працягваюць клапаціцца пра нашу будучыню і абараняюць інтарэсы пенсіянераў, інвалідаў і дзяцей. Карэспандэнт «Звязды» завітаў у Мінскае гарадское ўпраўленне Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі, каб пацікавіцца гісторыяй і працай гэтай арганізацыі.

Ад алоўка да камп'ютара

— Пачыналася ўсё з Пенсійнага фонду, які быў арганізаваны ў 1991 годзе. А вось у ліпені 1993-га на аснове яго і Фонду сацыяльнага страхавання быў створаны Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Беларусі. У нашым упраўленні, напрыклад, працавала першапачаткова ўсяго 53 чалавекі. Яны з дапамогай толькі алоўкаў, крэслаў і сталоў усё стваралі. Упаўнаважаным (зараз галоўным інспектарам) даплачвалі як прыбіральшчыцам... Пасля ўжо з'явіліся першыя камп'ютары і адпаведныя спецыялісты, — расказвае **намеснік начальніка Мінскага гарадскога ўпраўлення Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Наталля ПРАКАПЕНКА**.

Вялікіх праблем няма ўжо гадоў 10

Першае, што давялося рабіць толькі што арганізаванай структуры — рэгістраваць плацельшчыкаў. У 1991-м іх было амаль 8 тысяч. У 1993-м — ужо амаль 14. За ўсімі трэба было сачыць, каб своечасова плацілі ўзносы. Інакчай людзі маглі застацца без пенсій і іншых выплат. «Аднак у 1994 годзе ўжо адзначаўся вялікі рост пратэрмінаванай запазычанасці. Былі прастоі прадпрыемстваў. Затрымліваліся выплаты пенсій. Зараз гэта ўжо даўно забылася», — адзначае Наталля Пракапенка.

— І фонд дапамагаў вырашаць гэтыя праблемы?

— Гэта і былі праблемы самога фонду. Захады прымаліся на дзяржаўным узроўні: напрыклад, рэструктурызацыя даўгоў, якая дазволіла выйсці арганізацыям на больш-менш стабільнае фінансава-эканамічнае становішча. Разам з прадпрыемствамі і фонд працуе ўжо гадоў 10 без асаблівых праблем. Самая галоўная наша задача — своечасова фінансаваць выплату пенсій і дапамог. З гэтым зараз няма складанасцяў. Што ж тычыцца Мінска, то ён увогуле ў рэспубліцы з'яўляецца «донарам»: ад 40 да 55 працэнтаў сабраных сродкаў мы аддаём у іншыя рэгіёны. Усе грошы цэнтралізавана паступаюць у фонд сацабароны, а далей ідзе размеркаванне. Апошнія гады і Мінская вобласць ужо не датуецца, а сама забяспечвае сябе сродкамі.

— Ці можаце вы назваць нейкія выключна важныя падзеі, звязаныя з працай фонду?

— Напэўна, самае важнае — увядзенне ў 2003 годзе персаніфікаванага ўліку. Рэспубліканская база даных бездакорна функцыянуе ўжо 10 гадоў. Там кожны мае індывідуальны асабовы рахунак, дзе захоўваецца інфармацыя пра ўсю працоўную дзейнасць. За 10 гадоў у некаторых людзей было столькі прыёмаў на працу і звальненняў ды звестак аб грамадзянска-прававых дагаворах, што яны і самі, калі іх спытаць, усё не ўспомняць. А ўсе гэтыя звесткі ўлічваюцца для будучага назначэння пенсіі.

У 2009 годзе таксама з'явіўся новы кірунак у нашай дзейнасці. Гэта прафесійнае пенсійнае страхаванне — кампенсацыя за працу ў шкодных, цяжкіх умовах. Прадпрыемствы, якія маюць так званыя асаблівыя ўмовы працы, выплачваюць большыя ўзносы, чым звычайныя. Усе плацяць 35 працэнтаў, а яны ад 1,5 да 4,8 працэнта дадаткова. І гэта накапляльная сістэма. Узносы ўлічваюцца і капіталізуюцца (іншымі словамі, размяшчаюцца ў банкі і на іх разлічваецца даход). Далей гэтыя грошы выплачваюцца чалавеку ў выглядзе прафесійнай пенсіі — ці дадатковай, ці датэрміновай. Тут фонд ад збору сродкаў да выплаты працуе. Пры звычайнай пенсіі фонд толькі збірае сродкі, а ўпраўленне сацабароны, пасля налічвае і выплачвае пенсію.

Плацяць усе

— Раней пратэрмінаваныя запазычанасці маглі даходзіць да 30 працэнтаў месячнай сумы пералічэнняў. Гэта шмат. А зараз не перавышае 0,5 працэнта. Усе плацяць. Ёсць паняцце несвоечасовасці, але плацяць усе», — расказвае Наталля Пракапенка.

— А вы неяк сочыце за тымі, хто вам плоціць узносы? Бо бываюць жа не толькі буйныя прадпрыемствы, але і малыя.

— Сродкі збіраюцца незалежна ад памеру прадпрыемства ці арганізацыі. У нас ёсць права на тое, каб самім спісаць з банкаўскага рахунку патрэбную суму, калі нам не плацяць. Іншая справа, калі на рахунку нічога няма. Тады ўжо падаем у суд. А што тычыцца індывідуальных прадпрымальнікаў, то гэта іх прамая зацікаўленасць у выплаце страхавых узносаў. Бо калі ён не плаціць, то яму не залічваецца працоўны стаж. Калі ён заплаціў менш, чым з разліку мінімальнай заработнай платы, то яму прапарцыянальна налічваецца стаж не год, а 9 ці 10 месяцаў. Яны самі павінны пра сябе клапаціцца. А ў працадаўцаў ёсць наёмныя работнікі, за якіх яны цалкам адказваюць. Стварэнне запазычанасці — гэта ўшчамленне пенсійных правоў. Аднак такія выпадкі бываюць. Гэта калі прадпрыемства становіцца банкрутам. І тады ў першую чаргу пацерпяць людзі, якія там працавалі.

— Што ж тады ім рабіць?

— Трэба добра разумець умовы, на якіх ты працуеш. Трэба глядзець наперад: што табе сёння выгадна — вялікія грошы ў шэрай схеме ці так званы сацпакет (на рукі менш, але потым гарантыя таго, што табе і бальнічныя, і пенсію выплацяць).

Увогуле з фондам зараз лічацца ў большай ступені, чым раней. Усе разумеюць, што трэба выплаціць зарплату і ўзносы. Бо, напрыклад, падаткі больш абязлічаныя. Яны ідуць на ахову здароўя, на культуру, на спорт і гэтак далей. А страхавыя ўзносы — гэта пенсійныя правы грамадзян. І фактычна чалавек (ці за яго працадаўца) плаціць самому сабе ў будучыні.

— Як вы лічыце, фонд зараз працуе дастаткова эфектыўна, каб у бліжэйшай будучыні людзі не баяліся за сваю старасць?

— Праца фонду цалкам залежыць ад стану эканомікі. Калі будзе працаваць эканоміка добра, будзем і мы так сама працаваць. Калі ёсць зрывы ў эканоміцы, у выплаце заработнай платы, калі фінансавая ўстойлівасць завагаецца, то пойдзем следам і мы.

Замест бюракратыі — новыя тэхналогіі

— Раней 40-50 тысяч плацельшчыкаў павінны былі раз на квартал здаваць справаздачу ў раённыя аддзелы. Зразумела, былі чэргі. Цяпер такога практычна няма, бо ўсё можна здаць па карпаратыўным партале фонду праз інтэрнэт. Мы пераконваем усіх у неабходнасці выкарыстання электронналічбавага подпісу, — тлумачыць спецыяліст фонду. — У гэтым плане фонд далёка пайшоў наперад. І плацельшчыкі да гэтага ўжо так прызвычаіліся, што, калі адбываецца нейкі тэхнічны збой, то пачынаюцца тэлефонныя званкі, бо ніхто не хоча вяртацца да чэргаў. Ужо нават прапісана ў заканадаўстве, што плацельшчыкі з колькасцю работнікаў звыш 10 чалавек абавязаны здаваць нам усе дакументы персаніфікаванага ўліку з электронна-лічбавым подпісам.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

КАЛЯСАЧНІКАЎ НАВУЧАЦЬ У ЛЕТНІКУ ПАЎНАЦЭННАМУ І НЕЗАЛЕЖНАМУ ЛАДУ ЖЫЦЦЯ

З 10 па 19 ліпеня на базе Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта пройдзе лагер-семінар актыўнай рэабілітацыі для інвалідаў-калясачнікаў.

Яго ладзіць грамадскае аб'яднанне «Рэспубліканская асацыяцыя інвалідаў-калясачнікаў» пры падтрымцы міністэрстваў працы і сацыяльнай абароны і спорту і турызму. Канчатковая мэта мерапрыемства: стымуляваць удзельнікаў праз набытыя веды і ўменні да пераасэнсавання жыццёвых каштоўнасцяў, фарміравання актыўнай пазіцыі, вядзення паўнацэннага і незалежнага ладу жыцця, перасоўваючыся ў інваліднай калясцы.

Кожны з курсантаў атрымае ўсе неабходныя веды і навыкі па самастойным жыцці: як кіраваць інваліднай каляскай, як займацца фізкультурай і спортам, як абслугоўваць самога сябе. Удзельнікам летніка дадуць першапачатковыя юрыдычныя веды. Акрамя гэтага, курсанты непасрэдна ўбачаць станоўчыя прыклады паўнацэннага жыцця ў інваліднай калясцы: на працягу ўсей працы лагера-семінара побач будуць жыць і даваць парады паралімпійскія чэмпіёны; інваліды, што сталі паспяховымі бізнесменамі; людзі, якія, знаходзячыся ў інваліднай калясцы, стварылі сем'і і нарадзілі дзяцей, атрымалі адукацыю і маюць добрую працу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЫРАТАВАЎ ПЕНСІЯНЕРА

У Оршы дзякуючы пажарнаму апавяшчальніку маці і сын (абое пенсіянеры) засталіся жывыя падчас пажару. Выпадковы чалавек выратаваў гаспадара дома.

— Пажар адбыўся каля 6 гадзін раніцы ў доме на вуліцы Лакаматыўнай. На момант узнікнення пажару ў доме знаходзіліся гаспадар, 1949 года нараджэння, і яго маці. Жанчына пачула сігнал апавяшчальніка, выйшла на вуліцу і паклікала на дапамогу мужчыну, які праходзіў каля дома. Да прыбыцця выратавальнікаў Алег Каткоўскі, які працуе майстрам вагоннага дэпо транспартнага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі» з ахопленага полымем будынка вывеў гаспадара. Апошні знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення, — паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — У выніку пажару гаспадар атрымаў тэрмічныя апёкі 2-3 ступені рукі, грудзей, жывата (да 17% цела). Ён быў шпіталізаваны ў хірургічнае аддзяленне Аршанскай гарадской бальніцы № 3 горада Барань. Прычына пажару — неасцярожнасць гаспадара пры курэнні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЯК АДНА БУХГАЛТАРКА ДВУХ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ АБАКРАЛА

У Партызанскае РУУС сталіцы з заявай звярнуліся два індывідуальныя прадпрымальнікі, якія западозрылі бухгалтарку ў... крадзяжы.

— Як высветлілася, летась да аднаго з прадпрымальнікаў на пасаду галоўнага бухгалтара ўладкавалася жанчына. У тым жа будынку, дзе размяшчаўся офіс гэтага працадаўцы, знаходзілася памяшканне яшчэ адной фірмы. Паміж новым супрацоўнікам і кіраўніцтвам абедзвюх арганізацый склаліся даверлівыя адносіны, — паведаміла прэс-сакратар Партызанскага РУУС г. Мінска Ганна Чыж-Літаш. — Як мяркуецца, маючы свабодны доступ да дакументаў, пячаткі і ўсіх неабходных камп'ютарных сістэм, жанчына пачала пералічваць грашовыя сродкі, што належалі двум арганізацыям, на розныя разліковыя рахункі ў якасці аплаты тавараў і паслуг, у выніку чаго ўтаіла частку атрыманага арганізацыяй-працадаўцам даходу ад яе ўладальніка. Увогуле за два з паловай гады зламысніца такім чынам атрымала больш за 100 мільёнаў рублёў. На гэтыя грошы яна паспела добраўпарадкаваць сваю кватэру, набыць новы халадзільнік, тэлевізар, мабільны тэлефон, а таксама адсвяткаваць свой дзень нараджэння ў адным з самых дарагіх рэстаранаў сталіцы. Калі жанчыну затрымалі, сваю віну яна не адмаўляла і падрабязна распавяла, як вяла «пазаслужбовую» дзейнасць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАНАДТА ДАРАГАЯ КАША

Жанчына выйшла на вуліцу ў вёсцы Дзімамеркі Лоеўскага раёна і ўбачыла дым з вокнаў суседняга дома. Яна пабегла да сваякоў гаспадароў гэтага дома, каб паведаміць пра пажар.

Дзед маленькіх дзяцей, якія заставаліся ў доме, кінуўся ў хату, каб выратаваць унукаў. Мужчына вынес з задымленага памяшкання і трохгадовага Вячаслава, і двухгадовую Віялету, але ж супрацоўнікі МНС, якія прыбылі на месца пажару, змаглі выратаваць толькі хлопчыка. Дзіця шпіталізавалі ў Лоеўскую бальніцу з апёкамі 8% цела. Высветлілася, што ў гэты дзень бацька знаходзіўся з раніцы на працы, а 23-гадовая маці на 40 хвілін выйшла разам з нованароджанай дзяўчынкай да сваякоў у дом насупраць — каб зварыць кашу. Старэйшых дзяцей маладая жанчына паклала днём спаць, але ж, хутчэй за ўсё, яны знайшлі сабе іншы занятак.

У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС гавораць, што асноўнай прычынай узгарання з'яўляецца свавольства з агнём. Дарэчы, гэтая шматдзетная сям'я не адносіцца да складаных і на ўліку не стаіць. У выніку пажару пашкоджаны канапа, абкурадымлены столь і сцены ў хаце.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Пакарыў Доліну і «штурмуе» Галівуд...

Ён вельмі рэдка дае інтэрв'ю і наўрад ці нехта папросіць у гэтага чалавека аўтограф, бо ён — не публічная персона. Пры гэтым ужо вядомы нават у Галівудзе, піша музыку для кіно, аранжыроўкі. Напісаў аранжыроўку ў тым ліку і для народнай артысткі Расіі Ларысы Долінай, якая сёлета будзе старшынстваваць у журы конкурсу маладых выканаўцаў «базару». Ларыса Доліна выканала аранжыраваную ім песню Фрэдзі Меркуры «The Time» падчас цырымоніі закрыцця юбілейнага XX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». На цяперашнім «базары» Вячаслаў ДАЦКЕВІЧ будзе музычным рэдактарам канцэрта закрыцця.

Вячаслаў — гітарыст, кампазітар, аранжыроўшчык, гукарэжысёр. Жыве і працуе ў роднай Беларусі і ў Лондане. Асабіста знаёмы з музыкантамі, якія працавалі разам з Полам Макартні, Стынгам і іншымі «зоркамі» сусветнай велічыні. Пра сваё асабістае жыццё расказвае вельмі неахвотна: «Так, халасты, але сустракаюся з дзяўчынай»...

— А нарадзіўся, вырас, навучыўся граць на класічнай гітары ў цудоўным Віцебску. Гітару ўпершыню ўзяў у рукі гадоў у 10. А зараз мне ўжо 45, — расказвае Вячаслаў. — Першае сур'ёзнае выступленне, памятаю, адбылося на Віцебскім абласным тэлебачанні ў 1983 годзе. І прайшло ў суправаджэнні акустычнай групы.

Як, бадай, большасць творчых людзей, Вячаслаў не вельмі любіць узгадваць канкрэтныя даты, дакладныя назвы сваіх твораў. Сціпла сказаў, што ён — аўтар некалькіх альбомаў. Першы альбом — «Музыка з французскага кіно і не толькі», другі — «Праз 17 гадоў»...

А чаму менавіта праз 17?

— Сустракаўся калісьці з дзяўчынай, якая зараз жыве ў Парыжы, не бачыліся з ёй 17 гадоў. Гэтая лічба і «натхніла». Але альбом прысвяціў не толькі ёй, а нейкаму «зборнаму вобразу» Музы, — успамінае Вячаслаў. — А яшчэ выйшаў альбом «Вяртанне» — у ЗША. Дарэчы, так здарылася, што мая музыка з гэтага альбома ўвайшла ў мультымедыйны дыск «Марк Шагал і Віцебск». Потым мне прапанавалі напісаць музыку для мастацкага кіно. Фільм пра каханне здымаецца ў Швейцарыі. Здымаюць польскія і швейцарскія кінематаграфісты. Хацелася б для Галівуда сур'ёзна папрацаваць. Ужо зроблена «прыступка» ў яго заваяванні: нядаўна мая кампазіцыя выконвалася там. Знаёмая дзяўчына, якая даўно жыве ў Лондане, выканала ў «імперыі кіно» мой твор...

Вячаслаў расказаў, што перыядычна працуе ў Лондане, дзе ў яго сяброў студыя. А віцебская «Студыя Вячаслава Дацкевіча», можна лічыць, — прадстаўніцтва лонданскай. Ды і чаму на радзіме «базару» не можа быць прафесіянальнай студыі гуказапісу, якая мае шырокія магчымасці? Высокатэхналагічная апаратура, якасная акустыка, увесь спектр студыйнай працы на абсталяванні, якое пастаянна абнаўляецца і адпавядае самым высокім сучасным стандартам — усё гэта ёсць у Віцебску (для тых, каму цікава, назва сайта Вячаслава: http://datskevich.com).

Пра гітару і родны Віцебск музыкант гаворыць з асаблівай цеплынёй.

— Гітара і Віцебск — любімы інструмент і любімы горад. Хацелася б напісаць цэлую кнігу пра іх і пра ўсё, звязанае з гэтым. Калі б перанесціся ў часе гадоў гэтак на 20-25... Той час вельмі моцна паўплываў на гітарную плынь Віцебска сённяшняга, і шмат хто з музыкантаў, не толькі гітарыстаў, успамінаюць яго як пачатак росквіту гітары, прычым у розных яе праявах: класічная музыка, джаз, рок, — кажа мой суразмоўца. — Сучасныя кампазітары, якія пішуць для гітары, ужываюць усю інтэрнацыянальную палітру гукаў, акордаў, якія ўбірала ў сябе гітара на працягу столькіх гадоў. І не дзіўна зараз пачуць у стылі рок элементы класічнай музыкі, у класіцы — джазавыя інтанацыі, у джазе — элементы фламенка, усходніх матываў і г.д.

Вячаслаў прызнаецца, што давялося яму папрацаваць і «на вуліцы».

— Было гэта ў пачатку 2000-х гадоў, — гаворыць Вячаслаў Дацкевіч. — У Варшаве на вуліцах паўтара года іграў. І дзякуючы гэтаму пазнаёміўся з вельмі цікавымі людзьмі. У Варшаве выйшлі мае тры альбомы. Потым гастраляваў з дзяўчынай: яна танцавала, я іграў.

— А якім чынам музыкант з правінцыйнага Віцебска «выйшаў» на тую ж Доліну?

— Наогул на «базары» я пачаў працаваць, дзякуючы Марыне Раманоўскай, намесніку дырэктара Цэнтра культуры «Віцебск». Між іншым, яна сёлета — рэжысёр канцэрта закрыцця «базару». А першы маштабны вопыт плённага супрацоўніцтва ў нас з Марынай адбыўся некалькі гадоў таму, падчас справаздачнага канцэрта прадстаўнікоў культуры Віцебскай вобласці «Кругаварот часу» ў мінскім Палацы рэспублікі... Марына Генадзьеўна як рэжысёр закрыцця «базару» сказала мне, што для фіналу фэсту патрэбна аранжыроўка. Я і зрабіў. Потым мне казалі, што Доліна была вельмі задаволена і перадавала мне прывітанне — завочна, бо я зноў з'ехаў у Англію.

Вячаслаў зараз у пошуках маладой беларускай спявачкі для конкурсу «Ерэван запрашае». Гэты фэст упершыню прайшоў леташняй восенню, і Вячаслаў быў запрошаны ў якасці члена журы.

Хацелася б для Галівуда сур'ёзна папрацаваць. Ужо зроблена «прыступка» ў яго заваяванні: нядаўна мая кампазіцыя выконвалася там. Знаёмая дзяўчына, якая даўно жыве ў Лондане, выканала ў «імперыі кіно» мой твор...

Напрыканцы размовы музыкант заінтрыгаваў: «У Лондане на лейбле AOA Records, саўладальнікам якога я з'яўляюся, будзе запісвацца альбом адной маладой беларускі. Хто яна? Гэта — таямніца. Яна — невядомая пакуль шырокай публіцы выканаўца, але мае патэнцыял матэрыял. Упэўнены, што яна з часам здолее заваяваць не толькі Беларусь»...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПІВА — БУДЗЕ. АЛЕ НА АДЛЕГЛАСЦІ

Фестывальную «валюту» — «васількі» — прыезджыя і ўдзельнікі міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» змогуць патраціць у 40 кавярнях і рэстаранах.

Як паведамілі ў дырэкцыі «базару», ужо вызначаны 37 аб'ектаў грамадскага харчавання, дзе разам могуць сесці за сталы больш за 2,9 тысячы чалавек. А ўсяго ў цэнтры фестывальных падзей адначасова могуць паснедаць прыблізна 6 тысяч чалавек. Лічба ўражвае.

Вопыт правядзення мінулых фэстаў паказвае, што прыезджым, як і гараджанам, вельмі спадабаліся вулічныя падворкі, якія сталі месцамі «прэзентацый» раёнаў Віцебшчыны. Такім чынам, не пакідаючы абласны цэнтр, у дні фэсту можна трапіць у «куточкі» Полацка, Оршы, Лепеля, Докшыц, Сянно і гэтак далей. На падворках заўсёды здзіўляюць гасцей. І, безумоўна, у першую чаргу — унікальнымі стравамі, рэцэпт якіх перадаецца з пакалення ў пакаленне. Сёлета падворкі запрацуюць каля культурна-гістарычнага комплексу «Залатое кольца г. Віцебска «Дзвіна», у новым віцебскім парку Пераможцаў, у самым цэнтры старажытнага Віцебска — на пешаходнай вуліцы, каля канцэртнай залы «Віцебск» і ў іншых месцах.

Піва і больш моцныя напоі сёлета падчас «базару» не забаронены. Але ж, як удакладнілі ва ўпраўленні ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама, перад пачаткам чарговага канцэрта ў радыусе 500 метраў ад сцэнічных пляцовак «базару» на рэалізацыю спіртнога будзе накладзена часовае табу.

У атэлях могуць многае расказаць аб тым, што некаторыя «зоркі» мастацтваў прыязджаюць на фестываль з кухарамі. Вязуць з сабой посуд і прадукты, нават ваду. Тлумачыцца гэта тым, што вядомыя артысты, асабліва замежныя, баяцца ўжываць «незнаёмую ежу». Але нават старажылы з ліку арганізатараў не ўспомняць, каб такія праблемы ўзнікалі. Тая ж Пугачова, памятаецца, снедала разам са «світай» у віцебскіх рэстаранах. І нічога сабе, падзякавала за абслугоўванне. А ўсё таму, што на фэсце ўсё якаснае: ад песняў і танцаў да страў. Ды і супрацоўнікі адпаведнай санітарнай службы падчас «базару» не спяць. Як і пажарныя, міліцыянеры.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗАПАВЕДНЫ СВЕТ ПАЛЕСКАЙ АМАЗОНІІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Наведванне «Прыпяцкага» запамінаецца надоўга. Яго ніколі не збытаеш ні з якім іншым запаведным кутком. Па своеасаблівасці ён не мае сабе роўных. Тут усё: рэльеф, глебы, гідраграфічная сетка, раслінныя і жывёльныя супольнасці — мае своеасаблівы палескі характар.

Крыху больш як сто гадоў таму тэрыторыя запаведніка ўяўляла сабой забалочаны раён. У канцы XIX стагоддзя на ёй была праведзена меліярацыя. Тут былі створаны каналы агульнай працягласцю каля 300 кіламетраў, у выніку чаго значныя плошчы асушаных балот пакрыліся лясамі. Да гэтага часу каналы ў многім страцілі карыснае дзеянне, і меліяраваная ў мінулым тэрыторыя зноў забалочваецца. Цяпер лясныя балоты па плошчы займаюць трэцюю частку запаведніка і, як сцвярджаюць беларускія навукоўцы, па ўсіх паказчыках з'яўляюцца эталонам балот палескага краю. Ім забяспечана абсалютная запаведнасць, бо іх роля ў прыродзе важная і разнастайная.

У «Прыпяцкім» хутка ўсвядомілі, што ахова экалогіі без эканомікі — нішто. Таму сёння на тэрыторыі парку дзейнічае шэраг профільных прадпрыемстваў, якія дапамагаюць вырашыць задачы эканамічнага дабрабыту запаведніка.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Многімі даследаваннямі абсалютна дакладна вызначана, што балоты — прыродныя акумулятары і рэгулятары вільгаці. Яны нараджаюць крыніцы, сілкуюць рэкі, падтрымліваюць раўнавагу ў шматлікіх прыродных працэсах. Захаванне балот у запаведніку мае велізарную навуковую і практычную каштоўнасць. Шырокая пастаноўка даследаванняў, звязаных з вядзеннем гідрамеліярацыйных работ у Палессі, дапаможа лепш і больш правільна выкарыстоўваць багацці гэтага краю, выявіць патэнцыйныя магчымасці яго прыроды.

Цёплае і працяглае лета, мяккая зіма, багатыя на пажыўныя рэчывы глебы, вялікая колькасць ападкаў і вільгаці спрыяюць добраму росту ў запаведніку дрэў, кустовых і травяністых раслін. Тут знайшлі сховішча рэдкія і ахоўныя віды раслін: вадзяны арэх, купальнік чорны, плаваючая сальвінія, рададэндран жоўты, наяда марская, лілея кучаравая (царскія кучары) і іншыя.

Сапраўднае багацце запаведніка — лясы. Імі пакрыта звыш 80 працэнтаў тэрыторыі. На верхавых балотах, выспах і градах пануе сасна, якая займае 52 працэнты пакрытай лесам плошчы. На глебах пераходных і нізінных балот дамінуюць бярэзнікі.

Але жамчужынай лясоў запаведніка з'яўляюцца сухадольныя і пойменныя дубровы. Яны займаюць больш як сем з паловай тысяч гектараў і з'яўляюцца ўнікальнымі ў Беларусі. Асабліва здзіўляюць сваёй веліччу грабавыя дубровы — чыстыя шыракалістыя лясы з магутных дубоў, ліп, клёнаў, ясеняў і грабаў. У нізінных мясцінах тут добра захаваліся своеасаблівыя дубова-грабава-сасновыя і альхова-дубовыя лясы.

Летам і восенню ўражвае вялікая колькасць ягад і грыбоў. Асабліва шмат тут чарніц, буякоў, журавін, бруснiц, малін і чорных парэчак.

Адна з важных адметнасцяў запаведніка — разнастайнасць лекавых раслін. Імі, як паказалі даследаванні спецыялістаў, найбольш багатыя бярозавыя, дубовыя і хваёвыя лясы.

Запаведнік насяляюць амаль усе найбольш тыповыя прадстаўнікі фаўны Палесся. Пазбягаючы старонняга вока, асцярожна перамяшчаюцца лясныя веліканы — ласі, жывуць дзікі, стройныя танканогія казулі, рысі, ваўкі, лісіцы, янотападобныя сабакі і зайцы. На звілістых рэчках і старых меліярацыйных каналах, лясных і пойменных азёрах шмат селішчаў бабра, выдры і андатры. У пойменных дубровах акліматызаваўся янот-паласкун, радзімай якога з'яўляюцца лясы Паўночнай Амерыкі. Прыжылася ў запаведніку і амерыканская норка. Сустракаюцца барсукі. Улетку яны любяць паласавацца ягадамі і грыбамі. Звычайныя тут дробныя драпежнікі: гарнастай, чорны тхор, ласка. Зрэдку можна сустрэць куніцу, якая мае вельмі прыгожы і каштоўны мех.

Разнастайны ў «Прыпяцкім» свет птушак. Умовы для іх тут ідэальныя, асабліва для ваданлаўных.

Распаўсюджаны ў лясах і іншыя птушкі, сярод якіх шмат неўчых. У глыбіні асабліва запаведных участкаў лесу, сярод верхавых балот, захаваліся глушцовыя і цецеруковыя такавішчы. З драпежных птушак сустракаюцца чорны каршун, ястраб-цецяроўнік, канюк, пустальга.

Шматлікія рэчкі, азёры і вадаёмы насяляюць 38 відаў рыб. Часта сустракаюцца шчупак, акунь, плотка, лінь, судак, лешч, сом.

Станоўчыя вынікі надзейнай аховы мясцовых ландшафтаў з кожным годам становяцца ўсё больш адчувальнымі. Супрацоўнікі запаведніка робяць усё для таго, каб гэты куток Палесся заўсёды быў такім, якім стварыла яго прырода — некранутым.

Зрэшты, у «Прыпяцкім» хутка ўсвядомілі, што ахова экалогіі без эканомікі — нішто. Таму сёння на тэрыторыі парку дзейнічае шэраг профільных прадпрыемстваў, якія дапамагаюць вырашыць задачы эканамічнага дабрабыту запаведніка, што, у сваю чаргу, дазволіла адшукаць сродкі на стварэнне эфектыўнага рэжыму аховы нацыянальнага парку. Акрамя аграпрамысловага і гандлёва-вытворчага, на тэрыторыі «Прыпяцкага» існуе яшчэ шэраг незвычайных, уласцівых толькі гэтай прыродаахоўнай установе прадпрыемстваў. Напрыклад, эксперыментальная лесапаляўнічая гаспадарка «Ляскавічы». Унікальнасць яе ў тым, што гэтая гаспадарка адначасова выкарыстоўвае ўсе прыродныя багацці лесу, забяспечваючы пры гэтым іх надзейную ахову і не дапускаючы перарасходу лясных рэсурсаў. Так, з прымяненнем імпартнага абсталявання тут пабудаваны сучасны дрэваперапрацоўчы комплекс, які дазваляе вырабляць піламатэрыялы еўрапейскага стандарта, што ідуць, у асноўным, на экспарт. У той жа час тут развіты такі працаёмкі для нашых паляўнічых гаспадарак кірунак работы, як вядзенне палявання ва ўмовах інтэнсіўнага лесакарыстання. Гэта дае магчымасць арганізоўваць на камерцыйнай аснове паляўнічыя туры для іншаземцаў. А ўжо за захаванасцю лясных угоддзяў і жывёльнага свету сочыць штатная егерская служба нацыянальнага парку, якая лічыцца адной з лепшых у рэспубліцы.

Рэгулярныя рэйды, якія ажыццяўляюць егеры парку сумесна з міліцыяй, дазваляюць захаваць прыродную разнастайнасць у недатыкальнасці, а самому «Прыпяцкаму» стварыць устойлівую рэпутацыю тэрыторыі, дзе браканьерам у прамым сэнсе няма чаго лавіць, акрамя вялікіх штрафаў, а то і крымінальнай адказнасці.

Добрапрыстойным жа грамадзянам можна спакойна прыехаць сюды ўсёй сям'ёй, узяць напракат надзіманыя лодкі, вуды, палаткі і ад душы парыбачыць на маляўнічым прыпяцкім беразе. А яшчэ ёсць магчымасць пражыць сапраўдную водную прыгоду — рачное фотасафары, роўных якому пакуль няма ні ў адным з беларускіх нацыянальных паркаў або іншых месцах адпачынку.

Пераабсталяванае са звычайнага буксіра-штурхача ў турыстычны цеплаход рачное судна з кают-кампаніяй, зручнымі спальнымі месцамі на сем чалавек, прасторным мастком і сытным камбузам ліха перасякае водныя прасторы Прыпяці. Цеплаход стаў плывучай гасцініцай, дзе экіпаж з капітана, матроса і кока гатаў выконваць пажаданні вандроўнікаў. Прыстаць на днёўку ў гэтай цудоўнай затоцы? Калі ласка. Парыбачыць у раёне вунь тых выспачак? Няма праблем. Падаць абед на палубу? Не пытанне...

Вось гэта і ёсць сапраўдны адпачынак на лепшай рацэ Палесся: калі цеплаход павольна ідзе паміж берагамі, не знявечанымі чалавечай дзейнасцю, а ты на мастку п'еш гарбатку з тураўскімі сметанковымі пампушкамі, час ад часу падносячы да вачэй бінокль або фотаапарат... Паглядзець ёсць на што: судна ідзе міма вядомых са старажытных часоў селішчаў, прасторных паплавоў, прырэчных палескіх вёсачак... А то раптам заплыве ў прахалодны цень пойменных дуброў або ясеннікаў, участкаў абсалютнай запаведнасці, дзе прыпяцкія лясы захаваліся ў сваёй спрадвечнасці...

Цеплаход стаў плывучай гасцініцай, дзе экіпаж з капітана, матроса і кока гатаў выконваць пажаданні гасцей, якія вандруюць. Прыстаць на днёўку ў гэтай цудоўнай затоцы? Калі ласка. Парыбачыць у раёне вунь тых выспачак? Няма праблем.

Зразумела, магчымасці размяшчэння турыстаў у нацыянальным парку не абмяжоўваюцца толькі цеплаходнымі каютамі. У аграгарадку Ляскавічы парк валодае двухпавярховай камфартабельнай гасцініцай «Над Прыпяццю», з уласным рэстаранам, залай для боўлінга і більярда, басейнам з саўнай. Чакаюць сваіх гасцей утульныя турыстычныя комплексы «Хлупінская Буда» і «Дарашэвічы», гасцявы домік рыбака і паляўнічага «Чарацянка», катэдж «Сосны» і гасцінічны домік у старажытным Тураве.

У запаведніку ёсць пешаходныя (веласіпедныя) маршруты з прывабнымі канцавымі пунктамі — у месцы пасялення соў, да цар-дуба, у зубрагадавальнік. У многіх месцах па берагах Прыпяці абсталяваны стаянкі для адпачынку. Словам, нацыянальны парк «Прыпяцкі» сёння гатовы прыняць гасцей і парадаваць іх самымі лепшымі ўражаннямі, якія здольна падарыць легендарнае беларускае Палессе.

Уладзімір АЛЯКСАНДРАЎ.

■ Далёкае — блізкае

«ВЫТОКІ» БЕЗ ШАБЛОНУ

У школьным музеі «Вытокі» правядуць экскурсію нават для аднаго чалавека

У Бераставіцкім раёне больш за сто населеных пунктаў, і ў кожным з іх — сваё мінулае, насычанае не толькі падзеямі, але і легендамі, паданнямі. Захаваць усё гэта для нашых сучаснікаў і нашчадкаў імкнуцца ў Малаберастaвіцкай сярэдняй школе, дзе стварылі музей «Вытокі».

— Каб стаць у нас экскурсаводам, трэба пастарацца. Гэта вельмі прэстыжна, — кажа ініцыятар арганізацыі і кіраўнік музея, настаўнік гісторыі Тамара Эйсмант.

А далей бяруцца за справу тутэйшыя школьнікі-экскурсаводы, якія заслужылі такое права на конкурснай аснове. Прычым робяць гэта так зацікаўлена, творча, што «дадуць фору» нават некаторым прафесійным гідам, якія шаблонна агучваюць тэксты з інтэрнэту.

Напрыклад, Павел Кацуба апавядае пра Верхаўлянскае свяцілішча — язычніцкі культавы комплекс побач з вёскай Верхаўляны. Гэта помнік з далёкіх часоў, калі нашы продкі лічылі багамі агонь, ваду, дрэва, камень, гром, маланку. Свяцілішчы ўзніклі яшчэ ў каменным веку і прысвячаліся Перуну — богу маланкі. На ўзгорку абкладвалася каменем пляцоўка дыяметрам сем метраў, якая была акружана ровам.

— Уявіце сабе, як правадыр племені прыводзіць на гэтае святое месца сваіх людзей, яны распальваюць вогнішча, языкі полымя ўзвіваюцца ў цемру. І гучыць песня-заклінанне ... — вось як Павел уяўляе гэтае язычніцкае дзейства.

Фота Сяргея ХІЛЮТЫ.

Дарэчы, школьныя краязнаўцы ўжо неаднойчы накіроўваліся туды ў экспедыцыі. Некаторыя знаходкі — камяні са знакамі — цяпер можна ўбачыць у музейнай археалагічнай калекцыі. А яшчэ адзін вынік гэтых падарожжаў — пачутыя ад тутэйшых старажылаў паданні. Паводле аднаго з іх, аднойчы за нейкую правіннасць людзі прынеслі да свяцілішча ў ахвяру не жывёлу, як звычайна, а маладую дзяўчыну. Пасля чаго гэтае месца стала праклятым, і нават цяпер людзі баяцца падыходзіць да яго, засяваць побач палеткі.

У музейным раздзеле «Хлеб — усяму галава» гасцей вітае ўжо іншы гід — Кірыл Панасевіч. Ён расказвае аб даўнейшых прыладах, якімі карысталіся мясцовыя земляробы, прапануе гасцям самім папрацаваць на жорнах і паспаборнічаць у веданні прымавак пра хлеб. А хтосьці, магчыма, і сёння зацікавіцца старажытным рэцэптам выпечкі хлеба.

Музей таксама знаёміць з адзеннем, якое калісьці насілі ў гэтых мясцінах, з побытам сялянскай хаты 1940-1950 гадоў. Нядаўна там з'явіўся яшчэ адзін экспанат — стойка для дзіцяці. Адно дзіця цяпер у калысцы, а другое можа і пастаяць (на здымку).

Адзін з самых каштоўных экспанатаў музея — драўлянае крэсла, абабітае скурай. Яно, верагодна, знаходзілася ў маёнтку графа Юндзіла побач з Малой Бераставіцай.

Усё ў музеі сабрана мясцовымі жыхарамі. У тым ліку і экспазіцыя, прысвечаная Вялікай Айчыннай вайне: фатаграфіі, асабістыя рэчы франтавікоў, узнагароды, падзякі камандавання, пісьмы з вайны дадому... Пайменна названы ўраджэнцы гэтых мясцін — тыя, хто загінуў на франтах, і тыя, хто вярнуўся, а таксама падпольшчыкі і ахвяры фашызму.

Першую экспазіцыю ў музеі «Вытокі» адкрылі чатыры гады таму, і ўжо сабралася столькі экспанатаў, што імі цікавяцца не толькі землякі, але і госці з Польшчы, Украіны. Нядаўна прыязджалі з Масквы. Будзеце на Бераставіччыне — пабывайце ў гэтым музеі, не пашкадуеце! Тамара Эйсмант кажа, што тут з радасцю правядуць экскурсію нават для аднаго чалавека.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *Бераставіцкі раён.*

ДА ЎРАЧОЎ ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

Пасля мадэрнізацыі ў Брагіне адкрылася цэнтральная раённая паліклініка. Гэта стала магчымым дзякуючы Дзяржаўнай палітыцы ў галіне абароны насельніцтва, якое пацярпела ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. На мадэрнізацыю, што пачалася ў 2011 годзе, з Гомельскага абласнога бюджэту было выдаткавана 6 млрд рублёў.

Цяпер пацыенты ў адным будынку могуць атрымаць не толькі медыцынскую, але і сацыяльную дапамогу — тут размешчаны і тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Хворым не прыйдзецца шукаць аптэку: набыць лекавыя сродкі можна на месцы. Дарэчы, паліклініка прыстасавана для людзей з абмежаванымі магчымасцямі — зроблены элементы безбар'ернага асяроддзя. Каб вяскоўцам, якія звяртаюцца да раённых урачоў па дапамогу, было больш зручна трапіць на прыём, расклад працы спецыялістаў адаптаваны да раскладу транспарту.

У межах мадэрнізацыі ў паліклініцы пачала дзейнічаць лакальная сетка паміж паліклінічнымі аддзяленнямі і стацыянарам. У рэгістратуры ўведзена электронная картатэка, а замовіць талон на прыём можна не толькі па тэлефоне, але і праз інтэрнэт, ёсць сістэма відэаназірання і аўдыязапісу. Акрамя таго, уведзена міні-АТС, што дазваляе кансультаваць асобных пацыентаў па тэлефоне. Аддзяленне стаматалогіі цалкам змяніла абсталяванне на новае, сучаснае. Усе кабінеты прыёму прыстасаваны як для пацыентаў, так і для супрацоўнікаў паліклінікі. Прадугледжаны спецыяльныя пакоі для работы памочнікаў урачоў.

Галоўны ўрач Брагінскай цэнтральнай раённай бальніцы Ігар Кірэня расказаў, што на працягу апошніх пяці гадоў у Брагіне адзначаецца натуральны прырост насельніцтва. Узровень нараджальнасці перавышае агульнарэспубліканскі і абласны і складае 14,5 на 1000 жыхароў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

«МАТУЛІНА ХАТА НА ПЕСНІ БАГАТА...»

Так спяваюць у адной са сваіх прыпевак самадзейныя артысты тэатра фальклору, створанага пры тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна Мінска. Гэты тэатр малады, але ў мікрараёне «Дружба», дзе жывуць аматары спеваў, ужо добра вядомы. Ён неаднойчы выступаў на сцэне тэрытарыяльнага цэнтра і гарадскога Палаца ветэранаў, на вуліцах і ў парках. Выканаўцы песень і прыпевак, традыцыйных танцаў і абрадаў самі вырабляюць сцэнічны рэквізіт, выкарыстоўваюць дэталі вясковага адзення мінулых часоў. Кіруе калектывам вядомы знаўца народнай харэаграфіі Мікола Котаў. Тэатр «Матуліна хата» аб'яднаў людзей розных узростаў, але большасць з іх сталага веку, выхадцы з вёсак. Таму песні і танцы выконваюць тут найбольш набліжана да ўзору, характэрнага для мінулых дзесяцігоддзяў. Невыпадкова выбрана і назва тэатра, бо менавіта з матулінай хаты нясем мы праз жыццё самыя светлыя ўспаміны.

На здымках:

Альвіра Праслава нарадзілася ў вёсцы Сунаі Капыльскага раёна. Цяпер яна жыве ў горадзе, але выдатна памятае вясковыя песні сваёй маладосці.

Васьмікласнікі мінскай сярэдняй школы №25 **Іван Буйніч, Міхаіл Марзалюк, Дзімітрый Васількоў** — моладзевая частка тэатральнага калектыву.

«Матуліна хата» ў мікрараёне «Дружба».

Яўген Пясецкі.

■ Ведай нашых!

СТАБІЛЬНА ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ

Каманда Белдзяржуніверсітэта заваявала сярэбраныя медалі ў фінале чэмпіянату свету па праграмаванні пад эгідай АСМ.

У складзе каманды выступалі студэнты 5 курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Раман Удавічэнка, Андрэй Малевіч і Сяргей Жгіроўскі. А трэніравалі каманду выкладчыкі ФПМІ прафесар Уладзімір Котаў і асістэнт Павел Іржаўскі.

Каманда БДУ адзіная ад Беларусі прабілася ў фінал, дзе бліскуча пацвердзіла свой стабільна высокі ўзровень. Каб зразумець, наколькі вострай была барацьба, дастаткова сказаць, што ў адборачных турах чэмпіянату ўзялі ўдзел больш як 29 тысяч студэнтаў з 2322 універсітэтаў 91 краіны. У выніку серыі вочных спаборніцтваў права ўдзельнічаць у фінале заваявалі лепшыя каманды са 120 універсітэтаў. У адпаведнасці з квотамі Еўропу прадстаўляла ў фінале 31 каманда, Паўночную Амерыку — 23, Лацінскую Амерыку — 17, Азію — 40, Афрыку і Блізкі Усход — 7, а Аўстралію і Акіянію — 2 каманды.

Камандам было прапанавана 11 тэкставых задач і прадастаўлены адзін камп'ютар, на якім на працягу 5 гадзін яны павінны былі распрацаваць матэматычную мадэль, вылічальны алгарытм і камп'ютарную праграму, прайсці аўтаматычнае тэсціраванне праграмы і бездакорна вырашыць максімальную колькасць задач. Беларусы правільна рашылі 7 задач!

Згодна з рэгламентам, пераможцамі фінальных спаборніцтваў становяцца, як правіла, 12 камандаў, якія паказалі самыя высокія вынікі: чатыры каманды атрымліваюць залатыя медалі, чатыры — сярэбраныя і чатыры — бронзавыя.

Чэмпіёнамі свету 2013 года сталі студэнты Санкт-Пецярбургскага нацыянальнага даследчага ўніверсітэта інфармацыйных тэхналогій, механікі і оптыкі, на базе якога і праходзілі фінальныя спаборніцтвы. Гэта пяты падобны поспех студэнтаў дадзенай ВНУ. У яе камандзе выступалі чэмпіёны свету мінулага года Міхаіл Кевер і Ніяз Нігматулін. А таксама кампанію ім склаў безумоўны лідар у асабістых спаборніцтвах беларус Генадзь Караткевіч, які зараз атрымлівае вышэйшую адукацыю ў Санкт-Пецярбургу. Дарэчы, больш чым два разы ўдзельнічаць у фінале студэнтам не дазваляецца.

Залатыя медалі атрымалі таксама каманды Шанхайскага ўніверсітэта Цзяа Тонг, Такійскага ўніверсітэта і Нацыянальнага Тайваньскага ўніверсітэта. Сярэбраныя медалі чэмпіянату разам з беларусамі заваявалі каманды Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, Варшаўскага ўніверсітэта і Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта.

Сёлета ў вочнай барацьбе засталіся ўвогуле без узнагарод каманды прызнаных ва ўсім свеце школ праграмавання з Саратаўскага, Навасібірскага, Уральскага і Маскоўскага фізіка-тэхнічнага універсітэтаў, а таксама з Масачусецкага і Стэндфардскага ўніверсітэтаў (ЗША).

Каманды беларускіх універсітэтаў удзельнічаюць у адборачных спаборніцтвах чэмпіянату свету па праграмаванні ўжо больш як 15 гадоў. Паўфінал спаборніцтваў Заходняга рэгіёна чэмпіянату свету, дзе заваёўваюцца пуцёўкі ў фінал, увогуле лічыцца «групай смерці», паколькі там прадстаўлены ўсе самыя буйныя і аўтарытэтныя ўніверсітэты постсавецкай прасторы. Нават проста трапіць у фінал лічыцца вельмі вялікай удачай. Між іншым, студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта рэгулярна прабіваюцца ў фінальную частку спаборніцтваў. У 2004 годзе ў Чэхіі яны заваявалі залатыя медалі, у 2008-м у Канадзе — бронзавыя, а ў 2012 годзе беларусы прывезлі з Варшавы сярэбраныя ўзнагароды.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Справы гаспадарчыя

УСЁ, ШТО ВЫРАСЛА, — У СЛОІК!

У народзе кажуць: летні дзень год корміць. Датычыцца гэта не толькі хлебаробаў, што спаборнічаюць у «бітвах» за ўраджай. Гарачая пара настае і для руплівых гаспадынь, якія соляць, марынуюць, марозяць, сушаць і гатуюць усялякія кансерваваныя прысмакі, каб узімку частаваць імі блізкіх. Карэспандэнт «Звязды» таксама вырашыла падрыхтавацца да сезону закатак.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У спадзяванні знайсці ўсё неабходнае для кансервацыі ў адным месцы я выправілася на Камароўскі рынак. Дасканала вывучыла асартымент, прадстаўлены на радах з садавіной і гароднінай. Кошт агуркоў, сезон якіх якраз пачынаецца, вагаецца ад 6 да 7,5 тысячы рублёў за кілаграм. Памідоры для кансервавання, як правіла, набываюць у канцы жніўня — пачатку верасня, таму каштуюць яны пакуль што не так прывабна, як агуркі: ад 14 да 18 тысяч. Усцешвае тое, што зяленіва для засолкі не трэба набываць паасобку: ужо гатовы пучок з разлікам на адзін слоік, у які ўваходзяць лісты хрэну, чорных парэчак, кропу і часнок можна набыць як у гандляроў на радах, так і ў бабулек поруч з імі за 5 тысяч.

Але слоікаў на рынку чамусьці не аказалася...

Вырашыла пашукаць у крамах. Зазірнуўшы ў некалькі гаспадарчых аддзелаў, зноў засталася ні з чым. Бліжэйшым пунктам, дзе знайшліся шкляныя слоікі розных памераў, стаў ЦУМ. У аддзеле посуду іх можна набыць як паасобку, так і ўпакоўкамі (па 20 штук). Адзін паўлітровы слоік каштуе 1900, слоік аб'ёмам 0,88 л — 2550, кошт слоікаў на паўтара, два і тры літры — 3650, 4500 і 5100 рублёў адпаведна.

Тут жа знайшліся і накрыўкі: звычайная бляшаная каштуе 600 рублёў, накрыўка пад закрутку без малюнка — 1000 рублёў, з малюнкам — 1200. За пластмасавую накрыўку без «язычка» трэба заплаціць 1100, з «язычком» — 950 рублёў.

Класічныя закатачныя машынкі ў ЦУМе каштуюць ад 42650 да 67900 рублёў. А вось машынкі-аўтамата тут не аказалася. Убачыла такую ў гаспадарчай краме за 110 тысяч. У той жа краме знайшоўся круглы бязмен, што паказвае вагу стрэлкай, каштуе ён 60 тысяч.

Пасля разліку асноўнага гаспадарчага «арсеналу» засталося толькі набыць складнікі, неабходныя для прыгатавання расолу. Усе іх можна купіць у любой прадуктовай краме. За літр воцату давядзецца заплаціць 10850 рублёў, за кілаграм солі — 3300, цукру — 8000. Кошты на лаўровы ліст і перац гарошкам вагаюцца ў залежнасці ад вытворцаў і ў сярэднім складаюць каля 5000 рублёў за дзесяціграмовы пакуначак.

Вось цяпер смела можна браць за кансерваванне. Які рэцэпт выбраць? Напрыклад, класічныя марынаваныя агурочкі, духмяныя і хрусткія. Гэты рэцэпт здаўна ў нашай сям'і пераходзіць ад маці да дачкі. На трохлітровы слоік спатрэбіцца 70 г солі, 50 г цукру, 50 г воцату (дадаецца ў слоік пад накрыўку, а не ў расол). У стрэрылізаваныя слоікі на дно пакласці лаўровы ліст, некалькі лістоў вішні і чорнай парэчкі, хрэн, кроп, перац гарошкам. Потым слоік даверху запоўніць агуркамі і заліць кіпнем для стэрылізацыі. Праз 30 хвілін ваду са слоіка зліць. Закіпяціць новую ваду і зноў заліць у слоік. Калі астыне, зліць у каструлю, дадаць соль і цукар. Зноўку закіпяціць і заліць агуркі. Закатаць, перакуліць на накрыўку, у такім выглядзе накрыць коўдрай і пакінуць на суткі. Пасля прыбраць для захоўвання. Смачна есці!

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■ Пляжны футбол

УРАЖАННЯЎ ХОПІЦЬ НАДОЎГА

Толькі няўдалае пенальці ў выкананні беларускага гульца перашкодзіла беларускай камандзе па пляжным футболе заваяваць «бронзу» на міжнародным турніры «Кубак Дружбы 2013». Саступілі беларусы ў насамрэч напружаным фінальным матчы гульцам каманды з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Перамаглі ў турніры футбалісты з Ірана, «серабро» — у зборнай Украіны.

Турнір адбыўся ў Віцебску на стадыёне па пляжным футболе ў пойме ракі Віцьба. У IV адкрытым Міжнародным турніры па пляжным футболе «Кубак Дружбы 2013» бралі ўдзел нацыянальныя зборныя Турцыі, Польшчы, Украіны, Беларусі і іншых краін.

Цікава, што падчас другога дня турніру яго ледзь не сарваў моцны дождж. Ваду з пляцоўкі, дзе праводзіліся гульні, адпампоўвалі выратавальнікі. Кіраўнік адной з камандаў нават агучыў ідэю спыніць чэмпіянат. Але ж было вырашана, што ён пройдзе згодна з праграмай.

У размове з прадстаўнікамі каманды Эміратаў высветлілася, што ў іх краіне 8 прафесійных камандаў. На іх погляд, спартсмены славянскіх краін лепш падрыхтаваныя ў фізічным плане.

Для правядзення міжнародных спаборніцтваў у Віцебску функцыянуе спецыялізаваны стадыён па пляжным футболе, які адпавядае ўсім еўрапейскім патрабаванням і стандартам. Сёння ФІФА і Сусветная арганізацыя пляжнага футбола (BSWW) разглядае магчымасць правядзення ў Беларусі адборачнага этапу Лігі Еўропы па пляжным футболе...

Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота Віктара НІКАЛАЕВА

■ Абітурыент—2013

УДЗЕЛЬНІКІ ЦТ І ЗДЗІВІЛІ, І РАСЧАРАВАЛІ...

Абітурыенты сёлетняга года не перастаюць здзіўляць і педагогаў, і грамадскасць. З аднаго боку, на сумныя думкі наводзіць дастаткова вялікая колькасць тых, хто не змог набраць на ЦТ мінімальную колькасць балаў, якая дазваляе прэтэндаваць на паступленне ў ВНУ, а з іншага — уражвае рэкордная колькасць стабальнікаў. Прычым упершыню за ўсе гады правядзення ў Беларусі цэнтралізаванага тэсціравання быў зарэгістраваны абсалютны максімум — стабальныя вынікі па ўсіх трох прадметах на ЦТ атрымалі адразу дзве абітурыенткі.

Выпускніца сталічнай гімназіі № 22 Ніна Барадуліна атрымала 100 балаў на ЦТ па рускай мове, матэматыцы і англійскай мове. А выпускніца 2011 года Рэчыцкага ліцэя Анастасія Таран набрала максімум на рускай мове, матэматыцы і фізіцы. І хто скажа пасля гэтага, што матэматыка і фізіка — не жаночыя дысцыпліны?

А ўсяго сёлета будзе выдадзена 247 стабальных сертыфікатаў. 227 абітурыентаў набралі сто балаў па адным прадмеце, 18 чалавек могуць пахваліцца двума стабальнымі сертыфікатамі і 2 чалавекі набралі на ЦТ 300 балаў.

Спецыялісты Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў падвялі папярэднія вынікі цэнтралізаванага тэсціравання. Зарэгістраваліся на ЦТ сёлета 117 768 абітурыентаў. Прынялі ўдзел у іспытах 113 448 чалавек. Не пераадолелі ніжні парог тэставага бала, устаноўлены для прэтэндэнтаў на атрыманне вышэйшай адукацыі, 40 682 чалавекі, або 35,86% ад агульнай колькасці ўдзельнікаў ЦТ. З іх 2064 абітурыенты не набралі мінімальны бал адразу па трох (!) вучэбных прадметах, 11 454 — па дзвюх дысцыплінах і 27 164 па адной вучэбнай дысцыпліне. Цяпер ім давядзецца падумаць пра навучанне ў сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных установах.

Такім чынам, ва ўступнай кампаніі ў ВНУ змогуць удзельнічаць 72 766 абітурыентаў. На навучанне за кошт сродкаў бюджэту запланавана прыняць 30,5 тысячы чалавек. Астатнім будзе прапанавана магчымасць прыняць удзел у конкурсе на платную форму навучання. План прыёму на яе складае 47 тысяч чалавек.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Добрая навіна

ГРОШЫ З ХАРАКТАРАМ

Банкнота Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь наміналам 200 000 рублёў прызнана пераможцам у намінацыі «Дызайн, які адлюстроўвае нацыянальны характар» прэміі Watermark Banknotes Awards, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка.

Дыплом і памятны медаль былі ўручаны прадстаўніку Нацыянальнага банка Беларусі падчас работы пятай Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі па абароненым друку Watermark Conference, якая праходзіла ў Санкт-Пецярбургу ў канцы чэрвеня. Конкурс быў арганізаваны выдавецкім домам «Уотэр Марк» і часопісам «Вадзяны знак» (Расія). У ім прымалі ўдзел банкноты, выпушчаныя ў абарачэнне ў перыяд паміж правядзеннем чацвёртай (2011) і пятай (2013) канферэнцый Watermark.

Нагадваем, што банкнота Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь наміналам 200 000 рублёў знаходзіцца ў абарачэнні з 12 сакавіка 2012 г. На яе адным баку намаляваны будынак Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П.В. Масленікава. Гэты будынак пабудаваны на пачатку XX стагоддзя. Першапачаткова ў ім размяшчаўся Зямельна-сялянскі банк. У архітэктуры будынка захаваліся рысы мадэрну і позняга класіцызму. На адваротным баку банкноты — дэкаратыўны калаж з архітэктурных элементаў будынка музея.

Дарэчы, дызайн усіх беларускіх банкнот распрацоўваецца мастакамі Нацыянальнага банка. Адлюстраванне на банкнотах архітэктурных і гарадабудаўнічых сюжэтаў стала традыцыйным. Зараз на банкнотах прадстаўлены ўсе рэгіёны краіны.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Открытое акционерное общество «Лукомльэнергомонтаж»,
расположенное по адресу:
г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район
контактные телефоны: 02133 60273; 02133 38338

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются: Открытое акционерное общество «Лукомльэнергомонтаж», 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район.

Цель приобретения акций, определенная общим собранием акционеров 17 мая 2013 года: для аннулирования и последующего уменьшения уставного фонда в целях сокращения их общего количества.

Количество приобретаемых простых (обыкновенных) акций: 10 000 штук.

Цена, по которой приобретаются акции: 30 000 рублей за одну акцию.

Сроки, форма и порядок оплаты: оплата производится в течение 30 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи. Оплата производится денежными средствами в наличной (безналичной) форме, определенной договорами купли-продажи акций.

Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район.

Даты начала и окончания срока представления предложения акционеров о продаже акций: с 1 июня 2013 г. по 30 июня 2013 г.

Даты начала и окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи): с 1 июля 2013 г. по 31 октября 2013 года.

Предложение о покупке акций, опубликованное в газете «Звязда» 20 июня 2013 г. № 112, считать недействительным.

УНП 300007839

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика	капитальное строение, инв. № 413/С-18368 (наименование – здание молокоприемного пункта), площадью 274 кв.м, 1949 года постройки
Местонахождение объекта	г. Свислочь, ул. Комсомольская, д. 35
Земельный участок	кадастровый номер 425250100001001767, площадью 0.3581 га, назначение – эксплуатация и обслуживание здания в г.п. Свислоч, ул. Комсомольская
Начальная цена продажи	127 404 480 (сто двадцать семь миллионов четыреста четыре тысячи четыреста восемьдесят) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	6 370 224 (шесть миллионов триста семьдесят тысяч двести двадцать четыре) белорусских рубля
Продавец	Волковысское ОАО «Беллакт», г. Волковыск, ул. Октябрьская, 133, тел. 8 01512 515 83
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41 98 32, 41 98 34
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.

Аукцион состоится 22 июля 2013 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30. Последний день приема заявлений – 19 июля 2013 г. до 15.00. Телефоны для справок: 41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».

КАМЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

Логойского района Минской области 9 августа 2013 года в 11.00 ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилого дома

№ п/п	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Расходы по подготовке документов	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	д. Середнее, д. 8А 623282710601000013	0,1528	4 975 633	5 348 000	1 069 600
2	д. Староганцевичская Слобода, д. 19А 623282712101000024	0,2500	4 975 633	8 250 000	1 650 000

Задаток перечисляется на р/с № 3600619071109, ЦБУ № 611, филиала № 500, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601, г. Логойска, УНП 600181630, ОКПО 044315476, код платежа 4901 Каменский сельский исполнительный комитет. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Аукцион состоится 9 августа 2013 года в 11.00 по адресу: Минская область, Логойский район, аг. Камено, ул. Центральная, д. 7 А.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 11.00 5 августа 2013 года.

Контактные телефоны: (8 01774) 72 3 35, 72 3 81, 8 (029) 170 02 61.

Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by

■ Інфарм-укол

ПАПІЛОМАВІРУСЫ З КАНЦЭРАГЕННЫМ ЭФЕКТАМ

Не так даўно вучоныя думалі, што вірусы папіломы чалавека, якія выклікаюць з'яўленне бародавак на скуры і слізістых, не маюць вялікага значэння. Аднак сёння ўжо размова ідзе пра сур'ёзную праблему, звязаную са смяротнымі захворваннямі. Як толькі вельмі дробныя і пазбаўленыя абалонкі вірусы папіломы чалавека трапляюць на скуру або слізістую абалонку анагенітальнай часткі цела, ротавай поласці, кан'юнктывы, мачавога пузыра, яны пранікаюць у клетку і пашкоджваюць яе генетычны апарат. Укараненне ў ДНК клеткі выклікае ў апошняй перадракавыя змяненні.

Паводле слоў **урача-эпідэміёлага Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Наталлі САЙКО,** вірус папіломы шырока распаўсюджаны, мае тэндэнцыю да росту і яго анкагеннасць даказана. Перадаецца папіломавірусная інфекцыя палавым шляхам. Заражэнне адбываецца пасля палавога кантакту з хворым або вірусаносьбітам, які не мае клінічных праяў, пры гэтым у гомасексуалаў вірус сустракаецца ў 5-10 разоў часцей, чым у гетэрасексуалаў. Магчымае і заражэнне ад інфіцыяванай маці дзіцяці падчас родаў. Паколькі вірусы ўстойлівыя да награвання, захоўваюцца ў адмерлых клетках скуры, то не выключаецца і кантактна-бытавы шлях перадачы праз мікрапашкоджанні скуры.

Вядома каля 300 тыпаў папіломавірусаў. Звыш 30 відаў пашкоджваюць анагенітальны тракт жанчын і мужчын. Даказана, што 16-ы, 18-ы, 39-ы і 45-ы тыпы — канцэрагены, якія часта становяцца прычынай раку шыйкі маткі, похвы, раку палавога члена. Нізкаанкагенныя вірусы (часцей гэта 6-ы, 11-ы, 40-ы і 42-і тыпы) — прычына генітальных кандылом. Большасць інфіцыяваных не ведаюць аб заражэнні. Скрыты перыяд пасля заражэння можа складаць ад 1 да 12 месяцаў.

ШТО СПРЫЯЕ ПАПІЛОМАВІРУСНАЙ ІНФЕКЦЫІ?

— малады ўзрост (15-25 гадоў), ранні пачатак палавога жыцця, вялікая колькасць палавых партнёраў;

— цяжарнасць, аборты, якія адкрываюць вароты для бактэрый і вірусаў;

— неабаронены бар'ернай кантрацэпцыяй секс;

— курэнне, ужыванне алкаголю, зніжэнне імунітэту, пераахалоджванне, вірусныя захворванні, гарманальныя парушэнні;

— хранічныя запаленчыя захворванні палавых органаў, урагенітальныя інфекцыі.

Сёння ў нашай краіне выкарыстоўваюцца дзве вакцыны супраць віруса папіломы чалавека: чатырохвалентная, якая змяшчае тыпы 6-ы ,11-ы, 16-ы і 18-ы, і двухвалентная, якая змяшчае тыпы 16 і 18. Шэраг еўрапейскіх краін уключылі імунізацыю супраць папіломавіруснай інфекцыі ў нацыянальныя календары прафілактычных прышчэпак. Вакцыны прызначаны толькі для прафілактычных мэт, яны не выдаляюць інфекцыю і не валодаюць лячэбным эфектам пры захворваннях, выкліканых вірусам папіломы. Па гэтай прычыне ўвядзенне вакцыны рэкамендуецца яшчэ да пачатку палавога жыцця ў дзяўчынак 9-10 гадоў. Імунітэт, які стварае вакцына, абараняе і ад некаторых іншых анкагенных вірусаў папіломы чалавека. Вакцынацыя праводзіцца трохразова і ў нашай краіне — на платнай аснове. Спецыялісты мяркуюць, што матулі павінны забяспечыць абаронай сваіх дачок ад папіломавіруснай інфекцыі, якая з'яўляецца асноўнай прычынай раку шыйкі маткі.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

Считать недействительным страховой полис филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Бресте: Зеленая карта BY/12/ № 8789614.
УНП 100706519

Утерянный полис страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА № 0373693 **считать недействительным.** УНП 100964704

Утерянное страховое свидетельство обязательного страхования граждан Республики Беларусь серии ВР № 2819226 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным.**

Технический администратор доменной зоны BY
УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ»
сообщает о проведении благотворительного аукциона на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра.

Средства от аукциона, кроме стандартной стоимости услуг по регистрации доменного имени и налогов, будут перечислены на нужды детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей.

Предметом аукциона являются доменные имена в доменной зоне BY, исключенные из реестра национальной доменной зоны. Перечень доменных имен, предлагаемых к регистрации по результатам аукциона, размещен на сайте https://auction.cctld.by

Дата начала аукциона – 12 августа 2013 г., дата окончания аукциона – 22 августа 2013 г.

Время начала аукциона – 12.00 даты начала аукциона, время окончания аукциона – 12.00 даты окончания аукциона. В случае, если в течение последних 2 минут до окончания аукциона была сделана ставка, срок проведения аукциона автоматически продлевается еще на 5 минут.

Аукцион проводится на интернет-ресурсе http://auction.cctld.by

В отношении каждого доменного имени, являющегося предметом аукциона, размещается программная форма, позволяющая участникам аукциона делать ставки.

Участниками аукциона могут быть юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, являющиеся резидентами или нерезидентами Республики Беларусь. Для участия в аукционе участник должен пройти регистрацию на сайте http://auction.cctld.by

Начальная цена предмета аукциона составляет 300 000 белорусских рублей. Шаг аукциона – 50 000 белорусских рублей.

Прием ставок прекращается по истечении 10 календарных дней после начала аукциона по каждому доменному имени.

Аукцион считается состоявшимся при наличии хотя бы одной ставки.

Победившим в аукционе считается тот участник, который сделал максимальную ставку к моменту окончания аукциона.

Текст Положения о порядке проведения аукциона на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра, находится на сайте http://auction.cctld.by в разделе «Правила проведения аукционов»

Организатор аукциона: УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ», УНП 100160363, e-mail: au@hoster.by

Тел. организатора +375 17 239 57 02.

Тел. комиссии по организации и проведению аукциона +375 17 239 57 77.

Два многоквартирных жилых дома № 6 и № 7 в микрорайоне №1 по проекту жилой застройки в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

УП «КАНИМИС» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства

ЗАСТРОЙЩИК – ЧТУП «КАНИМИС»

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 3 апреля 2003 года №505, в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100856965.

Юридический адрес: г. Минск, ул. Я. Коласа, д. 27, корп. 2, к. 28.

Почтовый адрес: г. Минск, ул. Гвардейская, д. 10, к. 1, телефон/факс +375173060802, +375173060781, режим работы: понедельник-пятница: с 9.00 до 18.00; выходные дни – суббота, воскресенье, обед с 13.00 до 14.00.

Ранее реализованные проекты: в настоящее время ведется строительство административного центра в квартале ул. К.Либкнехта и пер. Домашевский в г. Минске.

Цель строительства – исполнение инвестиционного проекта по договору № 239-Д на реализацию права проектирования и строительства объекта «Два многоквартирных жилых дома № 6 и № 7 в микрорайоне №1 по проекту жилой застройки в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева» от 18.05.2011 года с Минским городским исполнительным комитетом.

Объект строительства – два многоквартирных 16-этажных жилых дома № 6 и № 7 в микрорайоне №1 по проекту жилой застройки в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева.

Расположены в микрорайоне Сухарево в г. Минске.

Нормативная продолжительность строительства Объекта – 21 мес., ввод в эксплуатацию – III квартал 2013 года.

Застройщиком получены:

- Решение Мингорисполкома от 12 июля 2012 года №2218 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства».

- Свидетельство (удостоверение) №500/727-8015 о государственной регистрации создания земельного участка площадью 0,0065 га, расположенного по адресу: г. Минск, в границах ул. Шаранговича – Горецкого – Рафиева; свидетельство (удостоверение) №500/727-8031 о государственной регистрации создания земельного участка площадью 0,6381 га, расположенного по адресу: г. Минск, в границах ул. Шаранговича – Горецкого – Рафиева .

- Экспертное заключение РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗЫ» от 22.12.2011 года №1009-15/11;

- Разрешение Инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску №2-208Ж-139/11 от 01.03.2013 г.

Договор строительного подряда № 26/12 от 26.12.2012 г. с ООО «СМУ-25», №07/08-2012 с ООО «СК-12».

Жилые дома расположены в Фрунзенском районе г. Минска.

Жилые дома №6 и №7 запроектированы с теплым чердаком, плоской кровлей, пассажирским и грузопассажирским лифтом, встроенными административно-торговыми помещениями. Вентиляция в квартирах – естественная. Конструктивная схема зданий – монолитный каркас с заполнением поризованным кирпичом. Наружная отделка решена на основе применения современных отделочных материалов и конструкций.

Сведения о благоустройстве: Озеленение, устройство дорожных покрытий, благоустройство прилегающей территории.

В жилом доме №6 запроектирован автоматизированный теплопункт.

Всего в доме №7 – 77 квартир, из них для привлечения к строительству по договорам создания объектов долевого строительства дольщиков – **граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий**:

Однокомнатных общей площадью от 44,60 до 44,90 кв.м – 3 квартиры. Цена 1 кв.м – 12 697 100.

Двухкомнатных общей площадью от 60,96 до 67,33 кв.м – 3 квартиры. Цена 1 кв.м – 12 203 000.

Трехкомнатных общей площадью от 84,11 до 84,87 кв.м – 2 квартиры. Цена 1 кв.м – 11 656 500.

Все квартиры имеют летние помещения (лоджии).

Общее имущество, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков:

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, ненесущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию зданий.

Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить в офисе УП «КАНИМИС» с 17.07.2013 года по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 10 – 1А. Телефон/факс: 8(017)3060802, 8(017)3060781 с 9.00 до 18.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни: суббота, воскресенье.

БОБОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ГОМЕЛЬСКОГО РАЙОНА

14 августа 2013 года в 15.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Инженерная инфраструктура	Расходы по подготовке (руб.)	Начальная цена земельного участка (руб.)	Задаток (руб.)
1	Бобовичский с/с, д. Уза, ул. Городская, участок №66	321080801205000044	0,1191 га	Проектируется электроснабжение, водопровод	2901600 и расходы за опубликование в СМИ	27 366 100	2 736 600
2	Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Полевая, участок №182	321080800605000005	0,1203 га	Проектируется электроснабжение, водопровод	3306050 и расходы за опубликование в СМИ	30 595 900	3 059 600
3	Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Полевая, участок №183	321080800605000004	0,1203 га	Проектируется электроснабжение, водопровод	3251600 и расходы за опубликование в СМИ	30 595 900	3 059 600
4	Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Полевая, участок №192	321080800605000008	0,1202 га	Проектируется электроснабжение, водопровод	3278050 и расходы за опубликование в СМИ	30 570 500	3 057 050
5	Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Полевая, участок №193	321080800605000007	0,1203 га	Проектируется электроснабжение, водопровод	3193500 и расходы за опубликование в СМИ	30 595 900	3 059 600
6	Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Полевая, участок №194	321080800605000006	0,1202 га	Проектируется электроснабжение, водопровод	3249550 и расходы за опубликование в СМИ	30 570 500	3 057 050

Аукцион состоится по адресу: Гомельский район, аг. Бобовичи, ул. Пролетарская, д. 1А, зал заседаний Бобовичского сельисполкома **14.08.2013 в 15.00.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток в размере, порядке и сроке, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатков (на расчетный счет с отметкой банка).

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона или единственным участников аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет №3641414020045 Бобовичского сельского исполнительного комитета, ЦБУ №305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Барыкина, 94, МФО 151501664, УНП 400178403, код платежа 04901.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Бобовичи, ул. Пролетарская, 1А, Бобовичский сельский исполнительный комитет с даты опубликования извещения до 10 августа 2013 года.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в Бобовичском сельском исполнительном комитете.

Контактные телефоны: (8-0232) 910234, 910244, 910247.



Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

УСМІХНЕМСЯ

Прыём на работу.

— Як вас завуць?

— Васіль.

— Дзеці ёсць?

— Так, сын Васіль і дачка Васіліса.

— А жывёлы дома ёсць?

— Кот Васька!

— На жаль, мы не можам вас прыняць на пасаду крэатыўнага менеджара...

Калі імкнуцца абыходзіць усе непрыемнасці, можна прайсці міма ўсіх задавальненняў!

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ДАСКА, АДКАЗЫ

На гарызанталі: Бразілія. Шторм. Казка. Рэпліка. "Ланка". Сэнэт. Фарс. Кроп на. Анагат. Сана. Поплан. Бахілы. Друкар. Кук. Раса. Каліна. Анод. Дэні. Бар. Рэктар. Арама. Арала. Сан. Акула. Удача. Акардэон. **На вертыкалі:** Пятровіч. Лілія. Масква. Пекін. Урэза. Дзякан. Іскона. Асоба. Нарада. Каса. Расада. Іскра. Рака. Звон. Анучка. Ірэк. Дак. Антар. Кіраса. Лаза. Анфас. Люк. Чаравікі. Баран. Лучка. Стаціка. Растан.

■ На слыху

ЗАБОЙСТВА РАСКРЫЛІ ПРАЗ 11 ГАДОЎ

На Віцебшчыне застаюцца нераскрытымі каля 170 забойстваў мінулых гадоў. Іх расследаваннем займаюцца супрацоўнікі спецыяльнага міліцэйскага аддзела. Як канстатуюць у пракуратуры Віцебскай вобласці, сучасныя тэхналогіі дазваляюць праз гады выявіць злачынцаў.

У Пастаўскім раёне раскрылі забойства дзвюх бабуль, 1925 і 1939 гадоў нараджэння, учыненае яшчэ ў кастрычніку 2002 года. Паводле слоў Ігара Ластоўскага, намесніка пракурора Пастаўскага раёна, тады забілі гаспадыню дома і яе суседку. На іх трупах былі сляды ад пабояў, нажавых раненняў. Эксперты таксама ўстанавілі, што бабуль душылі.

З-за адсутнасці падазроных расследаванне крымінальнай справы было прыпынена. А летась з'явіліся новыя факты. Зараз крымінальная справа разглядаецца ў судзе. У год, калі забілі бабуль, малодшы з двух падазроных, 1986 года нараджэння, быў непаўналетнім. Судзяць зараз і яго саўдзельніка па крымінальнай справе — 1984 года нараджэння.

Падчас расследавання было ўстаноўлена, што гэтыя людзі прыйшлі ў дом бабулі, каб адабраць грошы. Яе забілі, як і суседку, якая, як лічаць следчыя, выпадкова аказалася ахвярай.

Пасля ўчынення забойства старэйшы з мужчын неаднаразова адбываў пакаранне за іншыя злачынствы. На волі ён працаваў ў сельскагаспадарчай арганізацыі. Ды і малодшы меў праблемы з законам. Потым жыў у Расіі, там працаваў.

За ўчыненае зладзеям пагражае пазбаўленне волі тэрмінам ад 8 да 25 гадоў, або нават пажыццёвае зняволенне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.51	21.39	16.48
Віцебск —	4.32	21.36	17.04
Магілёў —	4.41	21.29	16.48
Гомель —	4.46	21.16	16.30
Гродна —	5.08	21.52	16.44
Брэст —	5.17	21.44	16.27

Месяц

Маладзік 8 ліпеня. Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Іаанны, Марціна.*

К. *Амеліі, Антона, Віталя, Піліпа.*

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+18..+20°С	КІЕЎ	+22..+25°С
ВІЛЬНЮС	+17..+19°С	МАСКВА	+20..+23°С
РЫГА	+17..+19°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+20..+22°С

Даты | Падзеі | Людзі

1857 год — нарадзіўся (горад Віцебск) Анатоль Восіпавіч Бонч-Асмалоўскі, рэвалюцыянер-народнік, член арганізацый «Зямля і воля» і «Чорны перадзел». У 1879 годзе арыштаваны, высланы ў бацькоўскі маёнтак Блонь (цяпер Пухавіцкі раён). У 1881-м удзельнічаў у стварэнні падпольнай друкарні арганізацыі «Чорны перадзел» ў Мінску. У 1882 годзе зноў арыштаваны, зняволены ў турму. Адбыўшы пакаранне, арганізаваў з жонкай сялянскі гурток самаадукацыі, з сярэдзіны 1880-х гадоў ператварыў Блонь у апорны пункт рэвалюцыянераў розных напрамкаў (народнікаў, сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў-рэвалюцыянераў). Быў адным з арганізатараў і кіраўнікоў Рабочай партыі палітычнага вызвалення Расіі і Блонской сялянскай арганізацыі. Падчас рэвалюцыі 1905-1907 гадоў ваяваў на барыкадах Прэсні ў Маскве. Дэлегат Усебеларускага з'езда (1917). З 1918 года — у Мінску, актыўны ўдзельнік кааператыўнага руху. З 1926-га — у Маскве. Аўтар успамінаў. Памёр у 1930 годзе.

1941 год — пачалася абарона Ленінграда. У гэты дзень нямецкія і фінскія войскі атакавалі горад з паўднёвага захаду і з поўначы. Амаль адначасова былі нанесены ўдары на лужскім, наўгародскім і старарускім напрамках, у Эстоніі, на петразаводскім і аланецкім напрамках. Бітва за горад працягвалася па 9 жніўня 1944 года і стала самай працяглай у Вялікай Айчыннай вайне. Для сотняў тысяч ленінградцаў гэтая бітва была адзінай. Страта горада азначала ізаляцыю паўночных раёнаў СССР і страту марскіх баз для Балтыйскага флоту. Блакада Ленінграда стала найвялікшай трагедыяй у яго гісторыі. У жніўні 1941-га разгарнуліся баі на блізкіх подступах да горада. 30-га нямецкія войскі выйшлі да Нявы, перарэзаўшы чыгуначныя зносіны Ленінграда з краінай. 8 верасня, авалодаўшы Шлісельбургам, фашысты цалкам акружылі горад з сушы. Сувязь з Ленінградам падтрымлівалася цяпер толькі па Ладажскім возеры і па паветры. На фронт можна было даехаць на трамваі...

1947 год — нарадзіўся (вёска Дубровіца Клімавіцкага арёна) Васіль Іванавіч Барысаў, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар (2000). Аўтар навуковых прац па лазернай фізіцы, інтэгральнай і валаконнай оптыцы, радыёхвалевых метадах кантролю.

Было сказана

Леў САПЕГА, дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вялікага Княства Літоўскага:

«Усякі жыхар, што сваёю вольнасцю ганарыцца, але не хоча ні ўведаць, ні зразумець закону, якім абаронена вольнасць яго, заслугоўвае ганьбавання».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 23.555. Індэкс 63850. Зак. № 3053. Нумар падпісаны ў 19.30 9 ліпеня 2013 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12